Ш 25




# ШАРАШОВА І ПРУЖАНСКІ КРАЙ:

## ЭТНАГРАФІЧНАЯ, ФАЛЬКЛОРНАЯ, АРХІТЭКТУРНАЯ І МАСТАЦКАЯ СПАДЧЫНА РЭГЁНА

.5

НАЦЫЯНАЛЬНАЯ АКАДЭМІЯ НАВУК БЕЛАРУСІ
Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры
Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору
імя Кандрата Крапівы

# ШАРАШОВА І ПРУЖАНСКІ КРАЙ:

## ЭТНАГРАФІЧНАЯ, ФАЛЬКЛОРНАЯ, АРХІТЭКТУРНАЯ І МАСТАЦКАЯ СПАДЧЫНА РЭГІЁНА

### ДАСЛЕДАВАННІ І МАТЭРЫЯЛЫ

НАВУКОВАЯ БІБЛІЯТЭКА
Інв. № 656250
ГрДУ імя Янкі Купалы



Мінск
«Беларуская навука»
2025

УДК [39+72+75](476.7)
ББК 63.5(4Беи)
Ш25

Укладальнікі і навуковыя рэдактары:
кандыдат гістарычных навук С. У. Грунтоў,
кандыдат гістарычных навук В. М. Папко

Рэцэнзенты:
доктар мастацтвазнаўства, прафесар В. І. Жук;
доктар гістарычных навук, прафесар Т. А. Навагродскі

*Зборнік падрыхтаваны ў межах задання «Развіццё нацыянальных ідэнтычнасцей этнічных супольнасцей Рэспублікі Беларусь» падпраграмы № 2 «Культура і мастацтва» (навуковы кіраўнік – А. І. Лакотка) Дзяржаўнай праграмы навуковых даследаванняў на 2021–2025 гады «Грамадства і гуманітарная бяспека беларускай дзяржавы» (навуковы кіраўнік – А. А. Каваленя).*

**Шарашова** і Пружанскі край: этнаграфічная, фальклорная, архітэктурная
Ш25 і мастацкая спадчына рэгіёна : даследаванні і матэрыялы / Нац. акад. навук Беларусі, Цэнтр далед. беларус. культуры, мовы і літ., Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы ; уклад. і навук. рэд.: С. У. Грунтоў, В. М. Папко. – Мінск : Беларуская навука, 2025. – 399 с. : іл.
ISBN 978-985-08-3274-0.

Зборнік навуковых даследаванняў і матэрыялаў прадстаўляе спадчыну г. п. Шарашова і Пружанскага краю ў этнаграфічнай, фальклардыстычнай, архітэктурнай і мастацтвазнаўчай перспектыве. У кнізе змешчаны артыкулы навукоўцаў з Мінска, Брэста і Гродна, а таксама працы краязнаўцаў з Шарашова і Пружан. Выданне багата ілюстравана, вялікі акцэнт зроблены на публікацыю візуальных крыніц, у тым ліку малюнкаў і фотаздымкаў з фондаў Архіва ІМЭФ НАНБ. Зборнік падрыхтаваны да 645-годдзя Шарашова.

Кніга будзе цікава гісторыкам, этнолагам, фалькларыстам, мастацтвазнаўцам, а таксама ўсім аматарам рэгіянальных даследаванняў.

**УДК [39+72+75](476.7)**
**ББК 63.5(4Беи)**

**ISBN 978-985-08-3274-0**

© Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі, 2025
© Афармленне. РУП «Выдавецкі дом «Беларуская навука», 2025

# ЗМЕСТ

**Прадмова** . . . . . . . . 7

## ЛАКАЛЬНАЯ ГІСТОРЫЯ

**Папко В. М.**
Шарашоўскае староства ў 1798 г. . . . . . . . . 10

**Панамар Т. В.**
Мястэчка Шарашова напярэдадні Першай сусветнай вайны. . . . . . . . 24

**Горны А. С.**
Беларускі нацыянальны рух у Пружанскім павеце ў міжваенны перыяд . . . . . 43

**Резниченко А. Д.**
Социально-экономическое развитие Пружанского повета в 1921–1939 гг. . . . . 58

**Носко М. М.**
Псаломщик и фольклорист Григорий Романович Ширма.
Неизвестные страницы биографии . . . . . . . . 86

**Пракаповіч Н. С.**
Карныя аперацыі нямецкіх акупантаў на тэрыторыі былога
Шарашоўскага раёна ў 1941 г. . . . . . . . . 101

**Капылоў І. Л.**
Прозвішчы жыхароў Шарашова і навакольных вёсак як фрагмент нацыянальнай карціны свету беларусаў . . . . . . . . 131

**Папко В. М.**
Вёска Абруб і яе жыхары ў канцы XVIII – пачатку XXI ст. . . . . . . . . 142

## САКРАЛЬНАЯ СПАДЧЫНА: АРХІТЭКТУРА І МАСТАЦТВА

**Мароз В. В.**
Шарашова ў гісторыі яго сакральных помнікаў. . . . . . . . 165

**Флікоп-Світа Г. А.**
Іканастасныя абразы з царквы Нараджэння Багародзіцы г. п. Шарашова
Пружанскага раёна: гісторыя і атрыбуцыя. . . . . . . . 189

**Баженова О. Д.**
Икона Святой Варвары из Шерешева . . . . . . . . 214

**Грунтоў С. У., Мельнікаў М. П.**
Шарашоўска-Пружанскі рэгіён у фатаздымках экспедыцый ІМЭФ НАБ
1960–80-х гг. . . . . . . . . 221

**Грунтоў С. У.**
Хрысціянскія могілкі Шарашова . . . . . . . . 253

**Тамковіч Ю. В.**
Цвінтар былога касцёла ў вёсцы Ківацічы: гісторыя і эпіграфіка . . . . . . . . 270

## ЭТНАГРАФІЧНАЯ СПАДЧЫНА

**Віннікава М. М.**
Традыцыйнае адзенне Пружаншчыны . . . . . . . . 279

**Богдан П. А.**
Традыцыйны тэкстыль Пружанскага раёна . . . . . . . . 286

**Сахута Я. М.**
Пружанская кераміка . . . . . . . . 293

**Мілючэнкаў С. А.**
Артэфакты матэрыяльнай культуры вёскі Кацёлкі Пружанскага раёна ў малюнках этнаграфічнай экспедыцыі 1968 г. . . . . . . . . 299

## ФАЛЬКЛОРНАЯ СПАДЧЫНА

**Грыневіч Я. І.**
Фальклор Пружаншчыны ў запісах экспедыцыі 1948 г. . . . . . . . . 306

**Валодзіна Т. В.**
У гармоніі з сабой і светам: з пружанскіх экспедыцыйных знаходак 2019 г. . . . . 351

## ПА СТАРОНКАХ РЭГІЯНАЛЬНАЙ ПРЭСЫ

**Папко В. М.**
Сатыра і гумар у прэсе Шарашоўскага раёна (другая палова 1940-х – першая палова 1950-х гг.) . . . . . . . . 368

**Шаўчэнка Я. С.**
Свет дзікарослых раслін у штодзённым жыцці насельніцтва Пружанскага раёна ў другой палове XX ст. (паводле матэрыялаў раённага перыядычнага друку) . . . . . . . . 379

**Крумплеўская Г. А.**
Рэлігійнае жыццё насельніцтва Пружанскага раёна ў другой палове XX ст. (па матэрыялах раённых перыядычных выданняў) . . . . . . . . 388

**Звесткі пра аўтараў** . . . . . . . . 398

**А. С. Горны (Гродна)**

# Беларускі нацыянальны рух у Пружанскім павеце ў міжваенны перыяд

З пачатку XX ст. беларускі нацыянальны рух, дзякуючы ўласнай прэсе, кнігавыдавецкім праектам, культурна-асветніцкім і палітычным арганізацыям, пачаў паступова пашыраць свае ўплывы на розных тэрыторыях, дзе пражывала беларускае насельніцтва. У той жа час у некаторых рэгіёнах беларускае нацыябудаўніцтва мела сваю спецыфіку і асаблівасці развіцця. Такім рэгіёнам, напрыклад, было Палессе, дзе пасля Першай сусветнай вайны пачалі актыўна заяўляць аб сабе розныя нацыянальныя праекты: беларускі, польскі, рускі і ўкраінскі. Слабая палітычная актыўнасць і ідэнтычнасць жыхароў




Карта Пружанскага павета. 1920-я гг. Нацыянальная бібліятэка ў Варшаве

pawet.net

Палессяў, нізкі ўзровень сацыяльнай камунікацыі ў гэтым рэгіёне, выкліканы асаблівасцямі прыроднага ландшафту, прадвызначылі пэўныя цяжкасці ў распаўсюджванні ідэй беларускага руху і нацыянальнай дзяржаўнасці. Аднак тэрыторыяй, дзе гэтыя ідэі атрымалі значную падтрымку мясцовых жыхароў і значна ўплывалі на лакальнае палітычнае жыццё, стаў міжваенны Пружанскі павет. У сучаснай беларускай гістарыяграфіі развіццё беларускай актыўнасці на Пружаншчыне ў міжваенны перыяд даследавана адносна павярхоўна, што стварае падставы для больш дэтальнага вывучэння гэтага аспекту з выкарыстаннем малавядомых крыніц.

У статыстычным плане Пружанскі павет у міжваенны перыяд вылучаўся сярод астатніх паветаў Палескага ваяводства найбольшай колькасцю беларускага насельніцтва, прынамсі, з пункту гледжання польскай статыстыкі. Разумеючы палітычную ангажаванасць гэтай статыстыкі, якую прызнавалі нават польскія спецыялісты, вызначыць дакладную колькасць людзей з беларускай ідэнтычнасцю на сённяшні час вельмі складана. Падчас першага перапісу насельніцтва Расійскай імперыі 1897 г. у тагачасным Пружанскім павеце налічвалася 75,5 % беларусаў, 6,7 % украінцаў і 1,4 % палякаў [1, с. 102]. Аднак ужо пасля Першай сусветнай і польска-савецкай войнаў польская адміністрацыя, якая пачала кантраляваць абшары Пружаншчыны, значна заніжала долю беларусаў і павышала працэнт польскага насельніцтва. Па польскім перапісе 1921 г. у Пружанскім павеце налічвалася ўжо 46 % беларусаў (30 107 чалавек) і 44 % палякаў (28 448 чалавек) [2, s. IX]. Беларускі географ А. Смоліч, аналізу-




Рынкавая плошча. Пружаны, 1920-я гг. Нацыянальная бібліятэка ў Варшаве

ючы гэтыя лічбы, прыйшоў да высновы, што такі прырост польскага насельніцтва «нельга нічым растлумачыць» [3, с. 152]. Нават калі ўлічыць, што ў гэты час на тэрыторыю навета паступова вярталіся бежанцы часоў Першай сусветнай вайны, то прырост павінен быў назірацца адносна беларусаў, бо бежанцамі было пераважна мясцовае праваслаўнае насельніцтва.

Яшчэ больш дзіўнымі выглядаюць лічбы польскага перапісу насельніцтва 1931 г. Пры агульным росце насельніцтва Пружанскага павета, доля беларусаў і палякаў у ім скарацілася, затое ўзнікла новая група – «тутэйшыя». Нацыянальная складовая перапісу вызначалася па роднай мове і ўяўляла наступную карціну: 51,8 % жыхароў павета вызначалі сваю родную мову як «тутэйшую», 22,2 % – як беларускую, 16,3 % – як польскую [4, s. 27]. Феномен з'яўлення катэгорыі «тутэйшыя» ў Палескім ваяводстве стаў значнай дыскусійнай праблемай сярод гісторыкаў і этнолагаў. Напрыклад, польскі гісторык В. Сляшынскі бачыць у гэтым праяўленне мясцовага адміністрацыйнага рэсурсу, бо кіраўніцтва Палескага ваяводства менавіта ў гэты перыяд пачало праводзіць адносна «палешукоў» асобную рэгіянальную палітыку [5, s. 71]. Пагаджаючыся з уплывам палітычнага фактару на выніку перапісу 1931 г., хацелася падкрэсліць і іншую магчымую прычыну з'яўлення катэгорыі «тутэйшыя» ў Пружанскім павеце. Можна меркаваць, што актыўнае развіццё беларускіх структур у Пружанскім павеце, якое будзе разгледжана ніжэй, узмацніла і пашырыла нацыянальную ідэнтычнасць мясцовага насельніцтва, таму і была ўведзена катэгорыя «тутэйшыя», каб раздрабіць беларусаў, на фоне чаго польскі элемент выглядаў не такім малалікім.

Пасля ўваходжання Заходняй Беларусі ў склад Польшчы паводле Рыжскага міру ўздым беларускага нацыянальнага руху на гэтай тэрыторыі быў звязаны з выбарчай кампаніяй у польскі парламент 1922 г. Амаль усе тагачасныя беларускія палітычныя групы аб'ядналіся вакол Беларускага цэнтральнага выбарчага камітэта (БЦВК), які падчас выбараў блакіраваўся з іншымі нацыянальнымі меншасцямі Польшчы ў Блок нацыянальных меншасцей. Для правядзення агітацыйнай кампаніі БЦВК пачаў ствараць у розных мясцовасцях Заходняй Беларусі свае правінцыйныя структуры. Так, вядома, што ўжо ў канцы верасня 1922 г. у Пружанах дзейнічаў павятовы беларускі выбарчы камітэт [6]. У яго функцыі ўваходзіла каардынацыя дзеянняў агітатараў, распаўсюджванне беларускай прэсы і іншых агітацыйных матэрыялаў, фіксацыя парушэнняў выбарчага заканадаўства. У дзейнасці камітэта ключавую ролю адыгрывала мясцовая беларуская інтэлігенцыя, якая да гэтага часу паступова вярталася на Пружаншчыну з бежанства. У прыватнасці, менавіта з выбарчай кампаніі 1922 г. пачынаецца палітычная кар'ера ў беларускім руху Рыгора Шырмы. Ён прымаў актыўны ўдзел у агітацыйных мерапрыемствах на карысць БЦВК, меў кантакты з віленскім цэнтрам і тагачаснымі лідарамі нацыянальнага руху. У адным з лістоў да Б. Тарашкевіча Шырма скардзіўся на слабую агітацыю сярод сялян у Пружанскім павеце і заклікаў дасылаць больш беларускіх газет і лістовак, бо яны маюць попыт сярод вясковага насельніцтва [7, с. 115].

Выбары 1922 г. мелі для беларусаў пэўны вынік – у польскі парламент было абрана 11 беларускіх дэпутатаў сейма і 3 дэпутаты сената. Неўзабаве




Передвыбарчы плакат. Пружаны, 1920-я гг. Нацыянальная бібліятэка ў Варшаве

гэтыя дэпутаты ўтварылі першую ў польскім парламенце нацыянальную беларускую фракцыю – Беларускі пасольскі клуб (БПК). Мэтай фракцыі была абарона нацыянальных і сацыяльных правоў беларускага насельніцтва ў Польшчы легальным парламенцкім шляхам. Сябры БПК збіралі інфармацыю аб правапарушэннях польскай адміністрацыі адносна беларусаў, узнімалі найбольш вострыя пытанні нацыянальнага ўціску з парламенцкай трыбуны, наведвалі розныя мясцовасці Заходняй Беларусі дзеля арганізацыі мітынгаў і сустрэч з беларускім актывам. Каб спрыяць развіццю нацыянальнага руху ў правінцыі і мець сталыя сувязі з мясцовымі дзеячамі, БПК з 1923 г. пачаў арганізоўваць свае сакратарыяты ў заходнебеларускіх гарадах і вёсках. У Пружанскім павеце сакратарыяты БПК былі створаны ў Пружанах і Бярозе-Картузскай [8, арк. 7]. Кіраўніком першай структуры была мясцовая актывістка Кацярына Стаўбунік, другой – Андрэй Пазняк. У Пружанах сакратарыят БПК размяшчаўся па вул. Дамброўскага, 29 [9].

Важным кірункам дзейнасці сакратарыятаў БПК была арганізацыя справаздаўчых мітынгаў і сходаў, на якіх выступалі беларускія дэпутаты. У Пружанах першы такі мітынг адбыўся ў маі 1924 г., адразу стаўшы знакавай, ці нават скандальнай з'явай палітычнага жыцця. У пачатку мая 1924 г. мясцовы сакратарыят БПК абвясціў аб прыездзе беларускіх дэпутатаў і заклікаў навакольныя вёскі адпраўляць па два дэлегаты для ўдзелу ў мітынгу. 25 мая 1924 г. у горад прыехалі дэпутаты Фабіян Ярэміч, Васіль Рагуля і Павел Валошын; каб паслухаць іх прамовы сабралася каля 2000 чалавек, пераважна гэта былі мясцовыя жыхары, сяляне бліжэйшых вёсак і польскія асаднікі. Апошнія якраз крытычна ўспрымалі прыезд беларускіх дэпутатаў, называлі іх «правакатарамі» і «бальшавіцкімі агітатарамі». Пасля таго, як дэпутат Валошын пачаў казаць, што польскія ўлады ніякім чынам не дапамагаюць беларусам аднаўляць свае гаспадаркі, а раздаюць землі асаднікам, у яго бок пачалі ляцець камяні. Неўзабаве прысутныя на мітынгу асаднікі ўчынілі бойку, чым сарвалі мерапрыемства. Беларускія дэпутаты пад канвоем паліцыі вымушаны былі пакінуць мітынг і звярнуцца ў мясцовае староства з пратэстам. Дадзеныя падзеі сталі паказчыкам таго, наколькі вострымі ўжо ў пачатку 1920-х гг. былі пытанні польскага асадніцтва для

жыхароў заходнебеларускага рэгіёна [10, арк. 3–6; 11].

Яшчэ адной кампаніяй па пашырэнні нацыянальнай ідэнтычнасці стала акцыя па зборы школьных дэкларацый у 1925–1926 гг. Згодна з законам, прынятым у 1924 г., беларусы як нацыянальная меншасць Польшчы мелі права адчыніць беларускамоўныя школы толькі ў выпадку падачы адпаведнай колькасці дэкларацый бацькоў вучняў. З гэтай нагоды Цэнтральная беларуская школьная рада ў Вільні (ЦБШР) разгарнула ў 1925 г. шырокую дзейнасць па зборы дэкларацый, якая знайшла значны водгук сярод беларускага насельніцтва. Дзякуючы самаадданай працы беларускіх настаўнікаў, у першую чаргу згаданай вышэй актывісткі К. Стаўбунік, Пружанскі навет у 1925 г. выйшаў на першае месца сярод заходнебеларускіх паветаў па колькасці сабраных дэкларацый (1294 дэкларацый). У 1926 г. у павеце было сабрана яшчэ 725 дэкларацый [12, с. 39]. У той жа час мясцовыя ўлады стваралі розныя перашкоды ў справе збору дэкларацый, адмаўляліся зацвярджаць іх, патрабавалі аплату, запалохвалі насельніцтва. Зацверджаныя дэкларацыі школьнае кіраўніцтва наўпрост ігнаравала, бо не жадала адкрыцця беларускіх школ [13, с. 85]. Нягледзячы на сам факт вялікай колькасці дэкларацый, улады ў 1925/26 гг. навучальным годзе дазволілі функцыянаванне ў Пружанскім павеце толькі чатырох змешаных польска-беларускіх школ у вёсках Шані, Рудніку, Асаўцы і Стараволя [5, s. 206]. Такім чынам, з аднаго боку, школьная акцыя 1925–1926 гг. значна ўзмацніла нацыянальную ідэнтычнасць беларусаў, а з другога – адлюстравала негатыўнае стаўленне да іх польскай адміністрацыі, што стала адной з прычын папулярнасці левардыкальных арганізацый сярод насельніцтва так званых усходніх крэсаў.

Найбольш уплывовай арганізацыяй левардыкальнай плыні беларускага руху з'яўлялася нелегальная Камуністычная партыя Заходняй Беларусі (КПЗБ). Яе падпольныя ячэйкі ствараліся ў вёсках, куды ўваходзілі пераважна беларускія сяляне, якія такім чынам змагаліся супраць нацыянальнага ўціску і непапулярнай эканамічнай палітыкі польскіх улад. Паводле ўспамінаў паэта Міколы Засіма, першы раённы камітэт КПЗБ у Пружанскім павеце ўзнік у в. Шані ў 1924 г. [14, арк. 14]. На канец 1924 г. у межах гэтага камітэта існавала 26 ячэек, якія аб'ядноўвалі 160 актывістаў [15, с. 79]. У цэлым у павеце доўгі час дзейнічала два раённых камітэты КПЗБ – Пружанскі і Бяроза-Картузскі. Вызначыць дакладную колькасць сяброў гэтых структур вельмі цяжка, бо іх амаль кожны год пераследавала і арыштоўвала польская паліцыя, а падпольны характар партыі не прадугледжваў адкрытай партыйнай статыстыкі. Паводле падлікаў польскага гісторыка П. Ціхарацкага, у двух раённых камітэтах КПЗБ у Пружанскім павеце ў 1928 г. налічвалася 16 ячэек, а ў 1933 г. гэтая лічба ўзрасла больш чым у 4 разы і склала 75 ячэек. У той жа час колькасць актывістаў значна не вырасла: калі у 1928 г. іх было прыблізна 100, то ў 1933 г. – 277 чалавек [16, s. 40]. Дадзеныя лічбы паказваюць, што беларускія левардыкалы імкнуліся гарызантальна пашырыць свае структуры, ахапіць па магчымасці больш населеных пунктаў невялікімі ячэйкамі актыву, які праводзіў падпольную працу. У сярэднім у ячэйках КПЗБ працавалі 3–4 чалавекі, якія займаліся распаўсюджваннем нелегальнай літаратуры, вывешвалі чырвоныя транспаранты ці сцягі ў людных

месцах, праводзілі рэкрутацыю новых сяброў. Нягледзячы на сваю адносную малалікасць, дзейнасць актывістаў КПЗБ была заўважанай з'явай у заходнебеларускай правінцыі, якая трымала польскія ўлады ў пастаянным напружанні. Больш за тое, сябры КПЗБ маглі паралельна займацца іншымі палітычнымі праектамі легальнага характару, што значна пашырала грамадскую базу беларускага нацыянальнага руху. Адным з такіх праектаў была Беларуская сялянска-работніцкая грамада (БСРГ).

Гісторыя станаўлення Грамады і яе структур з'яўляецца важнай вехай развіцця беларускага нацыянальна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі. Непрадуманная сацыяльная і нацыянальная палітыка польскіх улад, а таксама


Білет № 6230
Гмыр (прозьвішча)
Уладзімер (імя)
па прафэсіі земляроб
які пражывае ў [illegible],
Селецкае гміны,
Пружанскага павету,
пошта Селец
зьяўляецца сябрам Беларускае Сялянска-Работніцкае Грамады.
ЦЭНТРАЛЬНЫ
Старшыня
Сэкрэтар
Вільня, дня 20/VIII 1926 году

Білет сябра Беларускай сялянска-работніцкай грамады У. Гмыра. 1926 г.
Цэнтральны дзяржаўны архіў Літвы

актыўнае нацыянальнае будаўніцтва ў БССР прывялі да таго, што літаральна за некалькі месяцаў леварадыкальная БСРГ пераўтварылася ў адну з самых масавых палітычных партый міжваеннай Польшчы. З чэрвеня 1926 г. амаль ва ўсіх паветах Заходняй Беларусі пачынаюць з'яўляцца гурткі партыі, у якія масава ўступаюць беларусы. Не абмінуў гэты працэс і Пружанскі павет, хаця вызначыць дакладную колькасць гурткоў БСРГ тут вельмі складана. Паводле ўнутрыпартыйнай дакументацыі на 1 снежня 1926 г. у павеце налічвалася 62 гурткі, якія аб'ядноўвалі 1736 сяброў [17, с. 88–89]. Аднак невядомы аналітык Палескага ваяводскага ўпраўлення, які з'яўляўся аўтарам даклада «Беларускі рух на Палессі ў 1922–1933 гг.», падкрэсліваў, што на лістапад 1926 г. у Пружанскім павеце было 107 гурткоў Грамады [18, арк. 24]. У дадзеным дакладзе таксама сцвярджалася, што ў Пружанах дзейнічаў павятовы камітэт БСРГ, хаця беларускі даследчык У. Палуян у сваёй працы аб БСРГ, абапіраючыся на партыйныя дакументы, не згадваў яго ў пераліку лакальных камітэтаў [17, с. 93]. Ва ўсялякім выпадку нават лічбу ў 62 гурткі для насельніцтва аднаго з палескіх рэгіёнаў, якое вызначалася сваёй палітычнай асцярожнасцю і малаактыўнасцю, можна лічыць вельмі паспяховай. Значную працу па стварэнні гурткоў і агітацыі ў павеце праводзілі такія актывісты, як Язэп Патапчук, Міхась Каўпак, Янка Кот, Уладзімір Гмыр, якія паралельна з гэтым мелі сувязі са структурамі КПЗБ. У прыватнасці, Патапчук выступаў на мітынгах у розных вёсках Пружаншчыны, дзе казаў, што ў Польшчы шмат войска і паліцыі, а няма беларускіх школ, заклікаў польскую ўладу спыніць праслед легальных гурткоў

БСРГ. Іншы актывіст У. Гмыр з в. Сашыцы, паводле польскага паліцэйскага, «хадзіў па вёсках і намаўляў людзей, каб запісваліся ў Грамаду» [19]. Аднак, асцерагаючыся ўзброенага паўстання на «крэсах», польскія ўлады прынялі рашэнне ў студзені 1927 г. пачаць працэс ліквідацыі БСРГ. Былі арыштаваны найбольш актыўныя дзеячы партыі, у тым ліку і пружанскія актывісты. Падчас судовага працэсу над актывам Грамады ў Вільні ў 1928 г. (так званы працэс 56-і) Я. Патапчук быў асуджаны на 5 гадоў турмы, М. Каўпак і Я. Кот – на 4 гады, а У. Гмыр быў апраўданы і вызвалены.

Развіццё палітычнай і грамадскай актыўнасці беларусаў, выкліканае з'яўленнем Грамады, пасля яе ліквідацыі знайшло свой працяг у структурах Таварыства беларускай школы (ТБШ). Арганізацыя выступала не толькі за адкрыццё беларускіх школ, але і імкнулася ажыццяўляць шырокую культурна-асветніцкую дзейнасць у заходнебеларускай правінцыі, звязаную з тэатральнымі пастаноўкамі, адкрыццём бібліятэк-чытальняў, пашырэннем самаадукацыі і г. д. У Пружанскім павеце, як і ў іншых паветах Заходняй Беларусі, многія актывісты разгромленай Грамады фактычна пераключыліся на дзейнасць гурткоў ТБШ. Згодна з унутранай статыстыкай, на ліпень 1927 г. у павеце дзейнічала 13 гурткоў таварыства, у склад якіх уваходзілі 294 чалавека [20, с. 23]. Дадзеныя гурткі падпарадкоўваліся Косаўскай акруговай управе ТБШ; за міжваенны перыяд у Пружанах так і не была створана ўласная акруговая структура таварыства. У той жа час лічбы гурткоў кожны год змяншаліся: польскія ўлады часта абвінавачвалі актывістаў ТБШ у антыдзяржаўнай дзейнасці, беспадстаўна навешвалі на іх ярлыкі «камуністаў», што давала магчымасць зачыняць гурткі. На пачатак 1930 г., паводле даных польскай паліцыі, у павеце функцыянавала ўжо 10 гурткоў ТБШ. Інфармацыя аб іх кіраўніцтве, наяўнасці бібліятэк і грамадскай актыўнасці змешчана ў табліцы, якая складзена на аснове паліцэйскай справаздачы [21, арк. 45–47]. Як бачна, некаторыя з гэтых гурткоў, на думку мясцовых улад, увогуле не праяўлялі ніякай дзейнасці, у той час як іншыя з'яўляліся сапраўднымі цэнтрамі развіцця беларускага руху ў сваёй мясцовасці. Гэта, аднак, не спыніла працэс ліквідацыі гурткоў польскімі ўладамі: на 1933 г. у павеце дзейнічалі ўсяго тры гурткі ТБШ [12, с. 53]. У маі 1933 г. улады ліквідавалі Косаўскую акруговую ўправу ТБШ, што фактычна паклала канец дзейнасці таварыства ў Палескім ваяводстве [22, с. 171].

Актыўнасцю ў правядзенні розных тэатральных пастановак вылучаўся гурток ТБШ у Бярозе-Картузскай. У першай палове 1928 г. ён фактычна кожны месяц арганізоўваў у горадзе беларускія прадстаўленні. 19 лютага 1928 г., як пісала тагачасная прэса, у Бярозе-Картузскай быў пастаўлены першы беларускі спектакль – драма У. Галубка «Апошняе спатканне» [23]. 8 сакавіка 1928 г. гурток ТБШ наладзіў у горадзе цэлую вечарыну, падчас якой былі пастаўлены п'есы «Страхі жыцця» Ф. Аляхновіча і «Збянтэжаны Саўка» Л. Родзевіча [24]. У красавіку 1928 г. бярозаўскі гурток паставіў п'есу Ф. Аляхновіча «Шчаслівы муж», даход з якой у суме 129 злотых пайшоў на арганізацыю беларускай бібліятэкі-чытальні [25]. Такая актыўнасць, безумоўна, выклікала ўвагу з боку мясцовай польскай адміністрацыі, якая ўсімі магчымымі сродкамі імкнулася спыніць пашырэнне беларускай культурнай прасторы. Гэта пры-

**Стан гурткоў Таварыства беларускай школы ў Пружанскім павеце ў пачатку 1930 г.**

| | Мясцовасць | Год ўтварэння | Колькасць сяброў | Агульная актыўнасць гуртка (у тым ліку ўтрыманне бібліятэкі) | Кіраўніцтва і актыў гуртка |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Шані | 1928 | 10 | Правядзенне тэатральных пастановак, у бібліятэцы 248 кніг (40 % белетрыстыкі, 40 % падручнікаў і навуковай літаратуры, 20 % сцэнічных твораў) | Канстанцін Ляўковіч (старшыня), Мікола Засім (бібліятэкар) |
| 2 | Бяроза-Картузская | 1928 | 24 | Правядзенне тэатральных пастановак, была заснавана бібліятэка | Антон Кісялевіч (старшыня), Мікалай Бродка (сакратар), Марыя Бродка (бібліятэкар), Уладзімір Залеўскі (скарбнік) |
| 3 | Блудзень (суч. Першамайская) | 1927 | 58 | Правядзенне тэатральных пастановак, была заснавана бібліятэка | Антон Макарэвіч (старшыня), Іван Гардзейчык (сакратар), Іван Барушка (скарбнік), Міхаіл Апурка (бібліятэкар) |
| 4 | Хвалава | 1927 | 25 | Правядзенне тэатральных пастановак, у бібліятэцы 440 кніг, гурток некаторы час утрымліваў беларуска-польскую школу | Кастусь Лукша (старшыня), Уладзімір Раўнейка (сакратар), Якуб Пананюк (скарбнік), Андрэй Гвай (бібліятэкар) |
| 5 | Клятное | 1927 | 17 | На 1929 г. дзейнасць гуртка была малаактыўнай | Мікалай Гарустовіч (старшыня), Міхаіл Хамета (скарбнік) |
| 6 | Мурава | 1928 | – | Пасля выезду ў Канаду трох актывістаў не праяўляў актыўнасці | – |
| 7 | Росахі | 1927 | – | Не праяўляў актыўнасці | Іван Андрусевіч, Аляксандр Мацыеўскі, Іван Клюкач |
| 8 | Козі Брод | 1927 | – | Не праяўляў актыўнасці | – |
| 9 | Асаўцы | 1929 | 15 | Правядзенне тэатральных пастановак, была заснавана бібліятэка | Васіль Скробат (старшыня) |
| 10 | Яковічы | 1929 | – | На пачатку 1930 г. гурток быў на стадыі заснавання | – |

вяло да таго, што актывісты бярозаўскага гуртка ТБШ не вытрымалі ціску з боку паліцыі і самараспусцілі гурток у 1931 г. [26, арк. 222].

Нельга не звярнуць увагу на дзейнасць гуртка ТБШ у в. Шані, якая знаходзіцца недалёка ад Пружан. Як сцвярджаў гісторык і краязнаўца А. Ільін, у 1920-я гг. гэтая вёска стала адным з найбуйнейшых цэнтраў беларускага нацыянальнага руху на Палессі [27, с. 345]. Гурток ТБШ быў створаны тут у 1928 г. і, дзякуючы намаганням яго старшыні Канстанціна Ляўковіча, а таксама мясцовай беларускай моладзі, пераўтварыўся ў моцную культурна-асветніцкую структуру. Сяляне нават перадалі на ка-

рысць гуртка будынак былой народнай школы, дзе размяшчалася кіраўніцтва гэтай структуры, а таксама бібліятэка-чытальня [28, с. 7]. У 1930–1932 гг. тэатральная трупа гуртка ў Шанях дала дзесяць спектакляў у вёсцы і ў павятовым цэнтры, якія карысталіся значнай папулярнасцю гледачоў і складалі канкурэнцыю польскім тэатральным калектывам [27, с. 346]. Дзякуючы ў тым ліку дзейнасці гэтага гуртка мясцовая моладзь ва ўмовах палітыкі паланізацыі абірала беларускі вектар свайго развіцця, паступала ў беларускія гімназіі і атрымлівала вышэйшую адукацыю, каб пасля папоўніць шэрагі нацыянальнай інтэлігенцыі. Прыкладам гэтага могуць быць асобы паэта Міколы Засіма, лекара Аляксандра Засіма, актывістаў Піліпа Засіма і Ніны Ляўковіч, якія былі выхадцамі шанеўскага беларускага асяродка. У той жа час рэпрэсіі з боку польскай улады не абмінулі і гэтую вёску. Гурток ТБШ у Шанях ліквідавалі ў 1932 г. У сакавіку 1934 г. была здзейснена спроба аднавіць дзейнасць гуртка, але кіраўніцтва Пружанскага павета адразу адмовіла гуртку ў рэгістрацыі [29, с. 27].



Мікола Засім (Wikimedia)

Пружанскі павет у міжваенны перыяд стаў ці не адзіным паветам Палескага ваяводства, дзе спрабавалі замацаваць свой унлыў структуры нацыянальна-дэмакратычнай плыні беларускага руху. Да гэтай плыні належалі арганізацыі, што прытрымліваліся хрысціянска-дэмакратычнай ідэалогіі ці ідэй аграрызму, якія былі вельмі папулярнымі ў міжваенны перыяд. Такімі арганізацыямі былі Беларуская хрысціянская дэмакратыя (БХД), Беларускі сялянскі саюз (БСС) і іх дачынная культурна-асветніцкая структура – Беларускі інстытут гаспадаркі і культуры (БІГіК). У прыватнасці, у 1913–1921 гг. у касцёле мястэчка Шарашова служыў прыхільнік беларускага хрысціянска-дэмакратычнага руху ксёндз Францішак Рамейка. Ён праводзіў казанні ў касцёле на беларускай мове, распаўсюджваў нацыянальную прэсу, узмацняў усімі магчымымі сродкамі беларускую ідэнтычнасць парафіян, чым заслужыў іх вялікую павагу. Такая дзейнасць ксяндза была недаспадобы мясцовым уладам, якія ў 1921 г. дабіліся яго пераводу ў іншую парафію [30, с. 54–55].

Пасля разгрому польскімі ўладамі левoff радыкальнай БСРГ у 1927 г. некаторыя яе актывісты ў Пружанскім павеце звярнулі ўвагу на легальныя структуры БСС, што адпавядалі іх сялянскім і нацыянальным перакананням. 30 кастрычніка 1927 г. у Бярозе-Картузскай у мясцовым тэатры адбылася пружанская павятовая канферэнцыя БСС,




Будынкі былога кляштара картузаў. Бяроза, 1920–30-я гг. Нацыянальная бібліятэка ў Варшаве

на якой прысутнічаў лідар партыі Ф. Ярэміч. Удзельнікамі канферэнцыі былі 63 чалавекі, большасць з якіх, верагодна, раней належалі да структур Грамады. На канферэнцыі быў утвораны павятовы камітэт БСС у складзе Сцяпана Салаўя (Сялецкая гміна), Антона Мычко (Бярозаўская гміна) і Уладзіміра Залеўскага (мястэчка Бяроза-Картузская) [31]. Апошні з іх, згодна з паліцэйскімі рапартамі, раней быў асуджаны за антыдзяржаўную дзейнасць і знаходзіўся пад наглядам паліцыі як актывіст КПЗБ [32, арк. 327]. Больш за тое, ён неўзабаве далучыўся да дзейнасці мясцовага гуртка ТБШ [26, арк. 222]. З гэтага можна меркаваць, што камітэт БСС фактычна не праводзіў ніякай актыўнай дзейнасці, а яго ўтварэнне было спробай мясцовых актывістаў знайсці легальныя сродкі для ажыццяўлення нацыянальнай дзейнасці. У той жа час на працягу пэўнага перыяду кіраўніцтва БСС мела сталыя зносіны з некаторымі актывістамі ў Пружанскім павеце. Напрыклад, кантакты з Ярэмічам і віленскімі нацыянальна-дэмакратычнымі арганізацыямі падтрымліваў Андрэй Пазняк з Бярозы-Картузскай, які выпісваў беларускія газеты і часопісы, займаўся нацыянальнай агітацыяй падчас важных палітычных кампаній [32, арк. 402]. Сталым карэспандэнтам, а некаторы нерыяд нават і рэдактарам друкаванага органа БСС «Сялянская ніва» быў актывіст з в. Сашыцы Пружанскага павета, былы дзеяч БСРГ Уладзімір Гмыр [33, с. 125].

У Пружанскім павеце некаторы час функцыянавалі структуры БІГіК – культурна-асветніцкай арганізацыі, створанай БХД і БСС як супрацьвага левы-радыкальнаму ТБШ. Неабходна адзначыць, што дзеячы гэтай арганізацыі звярталі ўвагу на Пружаншчыну ўжо з самага пачатку яе дзейнасці: у ка-




Вул. Пацэвіча ў Пружанах. 1920-я гг. Нацыянальная бібліятэка ў Варшаве

стрычніку 1926 г. яны, сярод іншага, дамагаліся адкрыцця ў в. Зарэчча Шарашоўскай гміны прыватнай беларускай школы [34, арк. 15]. Усяго за міжваенны перыяд у Пружанскім павеце было створана тры гурткі БІГіК – самы вялікі паказчык гэтай арганізацыі ў Палескім ваяводстве. Гурткі арганізацыі былі ў мястэчку Бяроза-Картузская (дзейнічаў у 1926–1931 гг., старшыня – Андрэй Пазняк, скарбнік – Францішак Оліхвер, сакратар – Аляксандр Ляўковіч), в. Дабучын (дзейнічаў у 1927–1930 гг., старшыня – Рыгор Кураўскі, скарбнік – Васіль Саўчыц, сакратар – Пётр Яцышка) і в. Бакуны (дзейнічаў у 1927–1930 гг. старшыня – Іван Лапука, скарбнік – Павел Шабуня) [26, арк. 137, 174адв.; 35, арк. 1адв]. Згодна з назіраннямі польскіх спецслужб амаль усе гэтыя гурткі не праяўлялі значнай арганізацыйнай актыўнасці, за выключэннем гуртка ў в. Дабучын, які арганізаваў шэраг тэатральных пастановак і меў уласную бібліятэку [36, с. 75]. Беларуская даследчыца К. Разуванава тлумачыць такую слабасць гурткоў БІГіК у Палескім ваяводстве адсутнасцю неабходнай дапамогі і падтрымкі з боку віленскага цэнтра, з чым нельга не пагадзіцца [36, с. 75]. Куратарства за гурткамі, прыезд у гурткі кіраўніцтва арганізацыі ці вядомых дзеячаў, папаўненне бібліятэк ажыццяўляліся ў моцных асяродках дзейнасці БІГіК, пераважна ў Віленскім і Навагрудскім ваяводствах, а на Палессе, якое лічылася перэферыяй нацыянальнага руху, фактычна не звярталі ўвагі, што, безумоўна, было значным пралікам. Немалаважнай праблемай таксама быў страх мясцовых актывістаў перад рэпрэсіямі з боку польскіх улад, што значна звужала магчымасці іх дзейнасці. Так, гуртком у в. Бакуны кіраваў вядомы ў павеце беларускі дзеяч І. Лапука, які ніяк не мог актывізаваць

сваю працу, бо знаходзіўся ў паліцэскіх спісах для нагляду [37, арк. 5].

Адной з найбольш актыўных прадстаўніц беларускага руху ў Пружанскім павеце ў міжваенны перыяд была Кацярына Стаўбунік. Яе біяграфія на сённяшні час даследавана вельмі слаба, што стварае падставы для грунтоўнага пошуку звестак пра гэтую забытую актывістку. Вядома, што яна нарадзілася прыблізна ў 1887 г. у Пружанах, дзе і жыла. Па прафесіі Стаўбунік была настаўніцай, аднак ва ўмовах пераследу беларускіх настаўнікаў польскімі ўладамі знайсці працу ёй было вельмі цяжка. Падчас Першай сусветнай вайны загінуў яе муж і яна сама выхоўвала траіх дзяцей [38, с. 113]. Пасля выбарчай кампаніі 1922 г. Стаўбунік узначальвала сакратарыят БПК у Пружанах і дзякуючы сталым кантактам з віленскімі беларускімі арганізацыямі займалася распаўсюджваннем беларускамоўнага друку, кніг, улётак. Частка мясцовай моладзі, якая знаходзілася пад яе ўплывам, а таксама ўсе яе родныя дзеці, паступілі вучыцца ў Віленскую беларускую гімназію і, такім чынам, далучыліся да арганізаванага нацыянальнага руху. У жніўні 1925 г. Кацярына Стаўбунік была арыштавана разам з 200 іншымі мясцовымі актывістамі па абвінавачванні ў «камуністычнай дзейнасці» і паўгода правяда за кратамі Гродзенскай турмы [39]. Яна мела добрыя сувязі з Рыгорам Шырмай і фактычна, дзякуючы іх грамадскаму дуэту, беларускі рух у Пружанскім павеце глыбока пранікаў у сялянскае асяроддзе. На гэты конт польская паліцыя паведамляла: «Стаўбунік і Шырма маюць вельмі шырокія кантакты з жыхарамі навакольных вёсак, якія знаходзяцца пад іх унлывам... Дзякуючы шматгадовай дзейнасці Стаўбунік на тэрыторыі Пружанскай і суседніх гмінаў зараз маецца значны працэнт нацыянальна




Будынак староства. Пружаны, 1920–30-я гг. Нацыянальная бібліятэка ў Варшаве

свядомых сялян...» [27, с. 345–346]. Адзін з публіцыстаў газеты «Сялянская ніва» ўзгадваў пра Стаўбунік наступным чынам: «Пакінуўшы дзетак дома, яна за некалькі вёрст хадзіла на вёскі і такім чынам збірала прыгавары на беларускія школы. Гэта сапраўдны тып упартай кабеты-барацьбіткі, змагаючайся за лепшую долю беларускага народа. Пружанскі павет такою жанчынаю можа толькі гардзіцца» [40, с. 3]. Вядома, што Стаўбунік памерла ў 1957 г. і пахавана ў Пружанах. На сённяшні час, на жаль, памяць аб ёй у горадзе ніяк не ўшаноўваецца.

Падводзячы вынік, неабходна заўважыць, што Пружанскі павет у міжваенны перыяд быў дастаткова моцным асяродкам развіцця беларускага нацыянальнага руху ў Палескім ваяводстве. Пік беларускай актыўнасці прыпаў на 1920-я гг., калі ў павеце дзейнічалі як легальныя, так і нелегальныя структуры нацыянальнага руху. У 1930-я гг. польскія ўлады разграмілі ці ліквідавалі павятовыя суполкі шэрагу беларускіх арганізацый, што звузіла нацыянальную актыўнасць толькі да працы ячэек КПЗБ ці асобных актывістаў. Важную ролю ў развіцці лакальных грамадскіх працэсаў адыгрывалі асобныя беларускія дзеячы – К. Стаўбунік, Р. Шырма, А. Пазняк і інш., якія мелі сталыя кантакты з віленскімі беларускімі арганізацыямі, адкуль атрымлівалі дапамогу для сваёй нацыянальнай дзейнасці. Кейс Пружанскага павета добра адлюстроўвае той факт, што падтрымка з боку цэнтра давала магчымасць развіваць структуры БСРГ, ТБШ, пашыраць школьную справу і ўмацоўваць у моладзевым асяроддзі нацыянальную ідэнтычнасць. У той жа час адсутнасць такой падтрымкі для нацыянальна-дэмакратычных структур, напрыклад, БІГіК, прыводзіла да згасання іх актыўнасці. Разам з гэтым трэба падкрэсліць, што беларускі праект дамогся ў Пружанскім павеце сваёй мэты: насельніцтва, раней фактычна апалітычнае і мала арганізаванае, паступова ў міжваенны перыяд пачало ўсведамляць сваю беларускую ідэнтычнасць і каштоўнасць барацьбы за нацыянальныя правы.

## Спіс выкарыстаных крыніц


1. Первая Всеобщая перепись населения Российской империи 1897 г. – СПб. : Изд. Центр. стат. Ком. М-ва внутренних дел, 1904. – Т. XI : Гродненская губерния. – 319 с.

2. Skorowidz miejscowości Rzeczypospolitej Polskiej. – Warszawa, 1924. – T. VIII : Województwo poleskie. – 83 s.

3. Смолич, А. Население Западной Белоруссии, его национальный и профессиональный состав / А. Смолич // Западная Белоруссия : сб. ст. – Минск, 1927. – Кн. 1. – С. 126–171.

4. Drugi powszechny spis ludności z dn. 9.XII 1931 r. Województwo poleskie. – Warszawa : nakładem Głównego Urzędu Statystycznego, 1938. – 280 s.

5. Śleszyński, W. Województwo Poleskie / W. Śleszyński. – Kraków : Avalon, 2014. – 336 s.

6. Адрасы Беларускіх Выбарных Каміт. // Беларускі Звон. – 1922. – № 20. – С. 4.

7. Пашкевіч, А. Нацыянальныя працэсы ў Палескім ваяводстве ў 1920-я гг. праз прызму вынікаў выбарчых кампаній у польскі парламент / А. Пашкевіч // Arche. – 2013. – № 4. – С. 99–210.

8. Дзяржаўны архіў Брэсцкай вобласці (ДАБВ). – Ф. 1. Воп. 9. Спр. 320.

9. Сэкрэтарыяты Беларускага Пасольскага Клюбу // Новае жыцьцё. – 1923. – № 10. – С. 4.

10. Centralne Archiwum Wojskowy. – Oddział II Sztabu Generalnego, sygn. I.303.4.2475, podteczka XI/A/3/C2b.

11. Хроніка // Сын Беларуса. – 1924. – № 4. – С. 4.

12. Вабішчэвіч, А. М. Нацыянальна-культурнае жыццё Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.) / А. М. Вабішчэвіч. – Брэст : БрДУ, 2008. – 319 с.

13. Загідулін, А. М. Беларускае пытанне ў польскай нацыянальнай і канфесійнай палітыцы ў Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.) / А. М. Загідулін. – Гродна : ГрДУ, 2010. – 183 с.

14. Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва. – Ф. 161. Воп. 3. Спр. 258.

15. Памяць : гісторыка-дакументальная хроніка Пружанскага раёна / Беларус. Энцыкл. ; рэдкал.: І. П. Шамякін (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БелЭн, 1992. – 454 с.

16. Cichoracki, P. Komuniści na Polesiu w latach 1921–1939 / P. Cichoracki. – Łomianki : LTW, 2016. – 271 s.

17. Палуян, У. А. Беларуская сялянска-рабочая грамада / У. А. Палуян. – Мінск : Навука і тэхніка, 1967. – 222 с.

18. ДАБВ. – Ф. 1. Воп. 9. Спр. 47.

19. Працэс Белар. Сялян.-Работн. Грамады // Голас працы. – 1928. – № 3. – С. 1.

20. Мятла, П. Аб Таварыстве беларускай школы і яго барацьбе / П. Мятла. – Менск, 1932. – 33 с.

21. ДАБВ. – Ф. 1. Воп. 9. Спр. 1306.

22. Смалярчык, А. Таварыства Беларускай Школы ў Палескім ваяводстве ў 1926–1933 г. / А. Смалярчык // Беларускі гістарычны агляд. – 2015. – Т. 22, сш. 1–2. – С. 153–177.

23. З Т-ва Бел. Школы // Голас працы. – 1928. – № 7. – С. 3.

24. З Т-ва Бел. Школы // Голас працы. – 1928. – № 5. – С. 4.

25. З Т-ва Бел. Школы // Голас працы. – 1928. – № 9. – С. 4.

26. ДАБВ. – Ф. 1. Воп. 9. Спр. 59.

27. Ільін, А. Пііліп Засім – забыты беларускі патрыёт з Палесся / А. Ільін // Arche. – 2013. – № 4. – С. 344–358.

28. Хроніка Т-ва Бел. Школы // Летапіс ТБШ. – 1933. – № 1. – С. 5–12.

29. З Хронікі Т-ва Беларускае Школы // Летапіс ТБШ. – 1936. – № 1–3. – С. 25–27.

30. Трацяк, І. Беларускае каталіцкае духавенства ў сацыякультурным працэсе першай паловы XX стагоддзя / І. Трацяк. – Гродна : ГрДУ, 2019. – Ч. 1. – 323 с.

31. Аб пружанскай павятовай канферэнцыі Бел. Сял. Саюзу // Сялянская ніва. – 1927. – № 83. – С. 2.

32. ДАБВ. – Ф. 1. Воп. 9. Спр. 64.

33. Ильин, А. Журналист-писатель и громадовец Владимир Гмыр / А. Ильин, Н. Синкевич // Гісторыя Беларусі ў XX стагоддзі. Памяці прафесара Івана Коўкеля : зб. навук. арт. / пад рэд. А. Горнага. – Гродна, 2017. – С. 120–128.

34. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. – Ф. 880. Воп. 1. Спр. 5.

35. ДАБВ. – Ф. 1. Воп. 9. Спр. 760.

36. Разуванава, К. С. Дзейнасць Беларускага інстытута гаспадаркі і культуры на тэрыторыі Палескага ваяводства (1926–1936 гг.) / К. С. Разуванава // Веснік Брэсцкага ўніверсітэта. Серыя 2, Гісторыя, эканоміка, права. – 2010. – № 1. – С. 73–78.

37. ДАБВ. – Ф. 1. Воп. 9. Спр. 1374.

38. Здановіч, І. Рупліўцы беларускага нацыянальнага адраджэння з Пружаншчыны : грамад.-літ. давед. / І. Здановіч. – Пружаны : [б. в.], 2003. – 144 с.

39. Хроніка // Жыццё беларуса. – 1925. – № 7. – С. 3.

40. Дабучынскі, М. З нядаўнага мінулага Пружаншчыны / М. Дабучынскі // Сялянская ніва. – 1926. – № 11. – С. 2–3.

Навуковае выданне

# Шарашова і Пружанскі край: этнаграфічная, фальклорная, архітэктурная і мастацкая спадчына рэгіёна

## Даследаванні і матэрыялы

Укладальнікі:
**Грунтоў** Сяргей Уладзіміравіч,
**Папко** Вольга Мікалаеўна

*У афармленні выдання выкарыстаны графічныя работы Б. Богшы, для вокладкі – фота С. Піліповіча*

Рэдактар *А. М. Масухранава*
Мастацкі рэдактар *У. У. Дамнянкой*
Тэхнічны рэдактар *В. А. Ткачова*
Камп'ютарная вёрстка *С. М. Касцюк, М. Э. Юрэня*

Падпісана да друку 07.05.2025. Фармат 60×84 1/8. Папера мелаваная.
Друк афсетны. Ум. друк. арк. 46,5. Ул.-выд. арк. 34,0. Тыраж 400 экз. Заказ 457.

Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства
«Выдавецкі дом «Беларуская навука».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/18 ад 02.08.2013.
Вул. Ф. Скарыны, 40, 220084, г. Мінск.

Адкрытае акцыянернае таварыства «Транстэкс».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 2/37 от 29.01.2014.
Вул. Чапаева, 5, 220034, г. Мінск.